
Рэкалекцыі

Аўтар: Рэдакцыя
25.07.2013 01:00



Назарэтанская моладзевая сустрэча для дзяўчат адбудзецца ў Навагрудку Сёстры назарэтанкі запрашаюць дзяўчынак з Гродзенскай дыяцэзіі і ўсёй Беларусі акунуцца ў моц Святога Духа падчас спецыяльных рэкалекцый, якія пройдуць 15-18 жніўня ў Навагрудку. Узрост удзельніц можа быць ад 15 гадоў і вышэй (з 9 класа школы). Тэмай трохдзённых рэкалекцый абрана ў гэтым годзе наступная: “Веру ў Духа Святога”. Правядзе рэкалекцыі кс. Уладзіслаў Сурвіла.

Тэлефон для сувязі: +37533 321 26 33 – сястра Клара. †

Чарговыя святарскія рэкалекцыі для ксяндзоў Гродзенскай дыяцэзіі Сустрэчы пройдуць у Рэкалекцыйным доме “Карытас” у Сапоцкіне ў два этапы. 8-11 верасня адбудзецца першы тур і 15-18 верасня – другі тур. Падрабязней чытайце ў камунікаце кс. б-па Аляксандра Кашкевіча. Просім паведаміць аб удзеле ў рэкалекцыях пісьмова або па тэлефоне ў курыю Гродзенскай дыяцэзіі да 15 жніўня.

Катэхетычныя курсы Гродзенскай курыі запрашаюць Кандыдаты, якія хочуць паступіць на катэхетычныя курсы, павінны да 30 жніўня падаць у сакратарыят Біскупскай курыі наступныя дакументы:

- атэстат сталасці
- пасведчанне аб здароўі
- пасведчанне хросту
- чатыры здымкі
- рэкамендацыйны ліст ад ксяндза пробашча
- біяграфію
- заяву аб прыняцці

Заняткі пачынаюцца 21 верасня 2013 г. а 9-й гадзіне і адбываюцца кожныя два тыдні ў суботу і нядзелю кожнага месяца на працягу трох з паловай гадоў.

Удзельнікі курсаў маюць магчымасць паглыбіць веданне сваёй веры на найвышэйшым узроўні. Выпускнікі курсаў могуць служыць дапамогай падчас правядзення катэхізацыі ў парафіях.